**ХРОНІКА**

# МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА ЭТНАПЕДАГОГІЦЫ Ў МАЗЫРСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПЕДАГАГІЧНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ



17–18 кастрычніка 2013 года ва ўстанове адукацыі “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна” адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Этнапедагогіка: гісторыя і сучаснасць”. Мерапрыемства дадзенага накірунку і такога маштабу было арганізавана ў навуковым цэнтры Палескага рэгіёна ўпершыню, аднак з’явілася лагічным працягам навукова-даследчага і вучэбна-выхаваўчага працэсу ва ўніверсітэце і прадэманстравала ўзаемасувязь этнічных і агульначалавечых каштоўнасцей. Глыбока сімвалічна, што праблемнае поле канферэнцыі сугучна з пытаннямі, актуалізаванымі ў пісьме Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ 04-01-07/0-231/1 ад 12.06.2012) аб ажыццяўленні комплексу мерапрыемстваў у вышэйшых навучальных установах краіны па адраджэнні народнай педагогікі.

На Міжнароднай канферэнцыі, якая аб’яднала даследчыкаў у галіне этнапедагогікі, былі прадстаўлены навуковыя школы Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана з гарадоў: Мінск, Масква, Кіеў, Астана, Архангельск, Бярдзянск, Брэст, Вялікі Ноўгарад, Вінніца, Віцебск, Глухаў, Гомель, Гродна, Іашкар-Ала, Магілёў, Мазыр, Ніжнявартаўск, Аранбург, Перм, Пскоў, Растоў-на-Доне, Самара, Саранск, Саратаў, Сімферопаль, Сургут, Ханты-Мансійск, Харкаў, Херсон, Чабаксары, Чалябінск і інш. У навуковым форуме прынялі ўдзел каля 150 даследчыкаў, сярод іх: 40 дактароў педагагічных, гістарычных, філалагічных, філасофскіх, сацыялагічных, фізіка-матэматычных навук, 66 кандыдатаў навук, аспіранты, магістранты, студэнты.



Канферэнцыю адкрыў прывітальным словам першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя 1.П. Шамякіна кандыдат педагагічных навук, дацэнт ***Валерый Сяргеевіч Болбас*** (на фота). У сваім выступленні “Вызначэнне асноўных паняццяў этнапедагогікі” Валерый Сяргеевіч акрэсліў асноўныя праблемы, якія разглядаюцца на навуковым форуме: распрацоўка метадалогіі этнапедагогікі і яе катэгарыяльнага апарату; асаблівасці этнакультурнага выхавання ва ўмовах глабалізацыі; вывучэнне і абагульненне этнапедагагічных ідэй асобных народаў; этнапедагагізацыя адукацыйнага працэсу на ўсіх узроўнях; стварэнне адаптаваных да сучаснага вучэбна-выхаваўчага працэсу этнапедагагічных тэхналогій, даступных кожнаму педагогу.

Прадстаўнічым у навуковым сэнсе атрымалася пленарнае пасяджэнне.

МГПУ им. И.П. Шамякина



З сярэдзіны 90-ых гадоў займаецца праблемамі этнапедагогікі ***Вадзім Аляксеевіч Салееў*** (на фота), доктар філасофскіх навук, прафесар Беларускай дзяржаўнай Акадэміі мастацтваў, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі. У сваім дакладзе “Этнапедагогіка ў эпоху глабалізацыі” В. А. Салееў адзначыў, што феномен глабалізацыі, з аднаго боку, стварае інфармацыйнае поле для дыялогу паміж рознымі народамі, з другога, прыводзіць да ўніфікацыі, страты самабытнасці нацыянальных культур. Пры гэтым адным з важных аспектаў захавання своеасаблівасці этнасу (нацыі), яго духоўнай культуры і з’яўляецца этнапедагогіка.



Аб канкрэтных шляхах вырашэння складанай культурнай і моўнай сітуацыі ў сістэме адукацыі Украіны гаварылася ў выступленні “Этнапедагогіка ці педагогіка глабалізму: выбар інавацыйнага вектара развіцця адукацыі” ***Галіны Алегаўны Несцярэнка*** (на фота), доктара філасофскіх навук, прафесара, загадчыка кафедры інавацый і інфармацыйнай дзейнасці ў адукацыі Нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. П. Драгаманава.

***Кацярына Анатольеўна Юр’ева***, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Харкаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя Р. С. Скаварады, у дакладзе “Этнапедагагічная падрыхтоўка будучых настаўнікаў ва ўмовах этнакультурнай разнастайнасці сучаснага грамадства” падзялілася вопытам работы з замежнымі студэнтамі, што актуальна і для нашага ўніверсітэта. У прыватнасці, пазнаёміла з такой формай работы, як арганізацыя “жывых бібліятэк”, што складаюцца з “жывых кніг”, у ролі якіх выступаюць студэнты з-за мяжы ці, наадварот, украінскія студэнты. Гэта дазваляе моладзі лепш зразумець культуру і традыцыі іншых народаў, а таксама спрыяе развіццю талерантнасці.

З далёкага горада Глазава, які лічыцца паўночнай сталіцай рэспублікі Удмуртыя, прыехала на канферэнцыю ***Вера Максімаўна Шырокіх***, кандыдат філалагічных навук, начальнік Цэнтра навуковай дзейнасці і знешніх інвестыцый, намеснік рэктара па навуцы Глазаўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. Г. Караленкі. У яе дакладзе “Этнакультурнае развіццё будучых педагогаў у ГДПІ” былі адзначаны асноўныя напрамкі выхавання і навучання студэнтаў на традыцыях Удмурцкай народнай педагогікі: вывучэнне геаметрыі народных узораў, выкарыстанне традыцыйнай народнай лялькі, якая не толькі вонкава, але і ўнутрана значна адрозніваецца ад Барбі, папулярнай у сучасных дзяўчынак.

Не менш прадстаўнічымі і насычанымі атрымаліся і секцыйныя пасяджэнні, дзе выкладчыкі, аспіранты, магістранты і студэнты Мазырскага ўніверсітэта змаглі пазнаёміцца з вядучымі даследчыкамі ў галіне этнапедагогікі, пранікнуцца праблематыкай гэтай старажытнай па ўзросце, але параўнальна маладой па навуковым асэнсаванні галіны педагагічнай навукі.

***Васіль Васільевіч Шур***, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, у сваім выступленні “Факультатыў “Радзімазнаўства: Мазыршчына” ў школах Палесся” пераканаўча даказаў, што рэгіянальны матэрыял з’яўляецца найважнейшым фактарам патрыятычнага выхавання моладзі, а крыніцы яго амаль невычарпальныя. Мазыршчына – гэта радзіма такіх вядомых у рэспубліцы і за яе межамі людзей, як Эдуард Пякарскі, Іосіф Яленскі, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Геся Гельфман, Вера Харужая, Аляксандр Крукоўскі, Пётр Ракіцкі, але далёка не кожны школьнік ці студэнт зможа адказаць, у чым менавіта іх заслугі.

Пра глыбінную сутнасць сямейных каштоўнасцей і само паняцце шматдзетнай сям’і, крытэрыі яе вызначэння ў беларускім грамадстве ўчора і сёння прымусіла задумацца выступленне ***Ірыны Іванаўны Калачовай***, доктара гістарычных навук, прафесара кафедры сацыяльнай камунікацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, “Беларуская сям’я ў савецкі і постсавецкі перыяд: трансфармацыя функцый і сямейна-шлюбных стратэгій”.

МГПУ им. И.П.Шамякина

***Любоў Васільеўна Ракава***, доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вядомая сёння як аўтар кніг па народнай педагогіцы беларусаў, даследчык традыцыйнай беларускай сям'і. У сваім дакладзе "Традыцыі сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст. І іх выкарыстанне ў сучаснасці" яна звярнула ўвагу на такую, здавалася б, нікім асабліва не заўважаную дэталь, як паступовае знікненне маральнага паняцця "сцінласць" і сціпласці як рысы нацыянальнага характару, якая праз выяўленне ў асабістым і грамадскім жыцці заўсёды выгадна адрознівала і станоўча характарызавала беларусаў.

Творчым поспехам можна назваць выступленне ***Васіля Васільевіча Шапялевіча***, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, загадчыка кафедры тэарэтычнай фізікі Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна. Даклад-прэзентацыя "Выхаваўчы, філасофскі і псіхалагічны матэрыял у народнай творчасці вёскі Каўняцін Пінскага раёна" падкупіў слухачоў не толькі псіхолага-педагагічным аналізам народных песень, запісаных аўтарам некалі ад маці, але і глыбокай любоўю вядомага вучонага-фізіка да сваёй малой радзімы, павагай да бацькоў, цікавасцю да вытокаў выхаваўчых традыцый, якія спрыялі і яго асабістаму станаўленню.

Практычную накіраванасць мелі выступленні маладых даследчыкаў народнай педагогікі, студэнтаў МДПУ імя І. П. Шамякіна: *Д. Г. Хомчанка* "Выхаванне навучэнцаў на народных традыцыях і абрадах" (навуковы кіраўнік Ю. Г. Брынзарэй), Н. А. Сігай "Выхаваўчы патэнцыял дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва" (навуковы кіраўнік В. С. Болбас) і інш.

У межах канферэнцыі калектывам Дзіцячай адукацыйнай установы "Весялінка" г. Растоў-на-Доне (Расія) быў праведзены майстар-клас "Глыбінныя сэнсы народнай гульні". У мерапрыемстве прынялі ўдзел выхаванцы ДУА "Яслі-сад № 15 г. Мазыра". Усім прысутным на мерапрыемстве адкрыўся чароўны свет народнай гульні, веліч і непаўторная прыгажосць славянскага фальклору, яго выхаваўчая сіла.

Творчы калектыў "Весялінка" пад кіраўніцтвам ***Аляксандры Аляксееўны Савосцінай***, выдатніка агульнай адукацыі Расійскай Федэрацыі, прывёз у Мазыр неабходныя інвентар і касцюмы, падключыў да праекта выхавацеляў і дзяцей з дашкольнай установы нашага горада. Госці прадставілі праграму духоўна-маральнага выхавання дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту "Лад", што асабліва зацікавіла студэнтаў і выкладчыкаў факультэта дашкольнай і пачатковай адукацыі Мазырскага ўніверсітэта.





Па выніках Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Этнапедагогіка: гісторыя і сучаснасць" выдадзены зборнік матэрыялаў, у якім змешчаны даклады на ўсходнеславянскіх мовах (беларускай, рускай, украінскай). Публікацыі, прадстаўленыя ў зборніку, сведчаць пра актуальнасць, запатрабаванасць і практычнае выкарыстанне ідэй этнапедагогікі навуковай супольнасцю родных этнасаў.

Канферэнцыя аб'яднала людзей неабыякавых, творчых – усіх, хто імкнецца спазнаць унікальны феномен народнай педагогікі і бясцэнную этнакультурную спадчыну для выхавання сучаснай моладзі і перадачы яе наступным пакаленням.

*Кандыдат педагагічных навук І. С. Сычова*
*Спецыяліст аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю Г. В. Юдзянкова*

МГПУ им. И.П. Шамякина